УДК 930.2-77(476)

# МЕСЦА БЛАГАЧЫННЫХ У СТРУКТУРЫ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XIX ст.

**Антановіч Зінаіда Васільеўна,**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Аўтарам разглядаюцца змены ў функцыянаванні благачынных на беларускіх землях на працягу XIX ст., якімі вызначылася іх месца ў структуры кіраўніцтва*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*праваслаўнай царквой. Найбольш значнымі сярод іх сталі пашырэнне абавязкаў і далучэнне судовых паўнамоцтваў, што прывяло да ліквідацыі духоўных праўленняў з-за перакрыжаванасці іх функцый і павышэння ролі благачынных як пасрэднікаў паміж непасрэднымі органамі епархіяльнага кіраўніцтва і прыходамі.*

Праваслаўная царква на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XX ст. мела мела іерархізаваную структуру кіраўніцтва з рэгламентаваннем кожнага ўзроўню. Благачынныя, як інстытуты пасрэдніцтва паміж вышэйшым праваслаўным клірам і мясцовым духавенствам, распаўсюджвалі распарадчую дакументацыю сярод духавенства (у сярэднім 10–15 прыходаў) і прадстаўлялі яго рапарты ў кансісторыі [17, Збор I, т. 30, № 23080; Збор II, т. 1, № 694], наглядалі за выкананнем царкоўных канонаў і маральным станам духавенства, у тым ліку выконваючы ў другой палове XIX ст. і судовыя функцыі.

На пасаду благачыннага абіраліся святары вопытныя, вядомыя добрымі паводзінамі і благанадзейнасцю [17, Збор I, т. 38, № 29711], як Іаан Панамароў (нар. каля 1763 г.), які нарадзіўся на тэрыторыі сучаснай Украіны і навучаўся “расійскай грамаце”. У 1790 г. ён быў рукапакладзены магілёўскім архіепіскапам Георгіем Каніскім і прызначаны святаром да Клімавіцкай царквы, а праз 18 гадоў абраны дэпутатам і благачынным. У 1795–1796 гг. І. Панамароў далучыў да праваслаўя 10 тысяч асоб мужчынскага полу, а затым узначальваў крычаўскае духоўнае праўленне і ў 1799 г. стаў протаіерэем. У 1807 г. ён перамешчаны ў Мінскую епархію, дзе стаў членам прысутнасці кансісторыі. З 1814 г. быў прызначаны з Мінскага сабора ў Кацярынінскую царкву, а ў 1823 г. вярнуўся ў сабор у якасці пазаштатнага святара [8, арк. 13–16].

Адным з найбольш значных абавязкаў благачынных было прадстаўленне ў кансісторыі створаных у цэрквах метрычных кніг і ведамасцей пра народжаных, шлюбаваных і памерлых, спаведных спісаў, збор сродкаў на розныя патрэбы, а таксама справаздач, кліравых ведамасцей, рапартаў духавенства. Напрыклад, сярод збіраемых па даручэнні Мінскага епіскапа ў 1817 г. звестак была характарыстыка стану цэркваў і прычтаў, неабходнасці іх рамонту, ацэнка магчымасці аб’яднання прыходаў [4, арк. 3–4]. Акрамя таго, благачынны наведваў прыходы штогод, звяртаючы ўвагу на справаводства ў іх, рыхтаваў прыходскае духавенства да візітаў епіскапа [1; 2; 7, арк. 6]. Асаблівая ўвага належала разбору прыхаджан з рымска-каталіцкім духавенствам, што адлюстроўвалася ў справаздачах [11, арк. 4–4 авд., 17]. Іншы кірунак дзейнасці благачынных звязаны з улікам сірот і ўдоў са святарскіх родаў, а таксама маёмасці, што заставалася пасля смерці духавенства [6, арк. 22–25]. Кантроль благачынных распаўсюджваўся таксама на стварэнне будаўнічых камітэтаў і будаўніцтва, перадачу ў арэнду царкоўнай маёмасці, выбар царкоўных стараст, вядзенне справаводства [3; 14; 15; 6, арк. 9–9 адв.].

Благачынныя актыўна ўзаемадзейнічалі з прыходскім духавенствам і ўплывалі на яго лёс, так, напрыклад, пры прызначэнні святара да гусарскага палку, які змяшчаўся у м. Біржы Упіцкага пав. Віленскай губ. [6, арк. 7–8.]. Лёсавызначальнымі былі і судовыя функцыі благачынных. У 1823 г. яны разглядалі справы па даручэнні епіскапа разам з дзвюма даверанымі асобамі ў прысутнасці земскага чыноўніка (сельскага старасты і інш.), як дэпутата для асоб, якія не належалі да духоўнага ведамства [17, Збор I, т. 38, № 29711]. Пры недахопе ўласных паўнамоцтваў у першай палове XIX ст. благачынныя маглі звяртацца са скаргамі ў духоўныя праўленні, якія аб’ядноўвалі сваёй дзейнасцю некалькі благачынных акруг [18]. Так, жыцінскі благачынны Максім Андрэеў скардзіўся ў бабруйскае духоўнае праўленне на святара Шыпілавіцкай царквы Міхаіла Шпілеўскага, які не з’явіўся за выдачай міры і не выкарыстоўваў гербавую паперу ў перапісцы. Нягледзячы на хваробу адказчыка, яму была вынесена строгая вымова [6, арк. 1–6]. У іншым выпадку справа па абвінавачванні цяшкоўскага свята-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ра Данілы Кладкевіча мазырскім благачынным Якавам Лаўрусевічам у неадпаведных паводзінах перадавалася ў Мінскую кансісторыю на апеляцыю [5, арк. 1–97]. Пры гэтым, калі прадугледжвалася выдаленне прадстаўніка духавенства з прыхода, то благачынны апекаваўся яго блізкімі, як Матронай, жонкай Іаана Андрыеўскага, і іх дзецьмі – Антоніем, Іллёй і Марыяй [9, арк. 35 адв.–36].

Паводле правілаў для саветаў благачынных 1886 г. у іх склад уваходзілі памочнік благачыннага (пачатковае апытанне) і духоўны следчы (фармальнае следства). Сферы іх кампетэнцыі належалі спрэчкі паміж членамі аднаго прычту і з суседскімі, падзеле грашовых збораў, нявыплаце ўтрымання, скаргі прыхаджан на духавенства па правядзенні набажэнстваў, грубасці, злоўжыванні спіртнымі напоямі. Духавенства падлягала суду Савета ў выпадках учынкаў супраць пасады, якія не ўносіліся ў фармулярныя спісы, нявыплаце пазык да 50 руб., асабістых крыўд, а таксама іншыя па даручэнні епархіяльнага кіраўніцтва, як абвінавачванне протаіерэя Аршанскага сабора Іаана Страціновіча ў рамонце ўласнага дома за кошт сродкаў на рамонт сабора [12, арк. 237, 496–526]. Савет прадстаўляў святароў да ўзнагароджання, у т.л. грашовага (да 25 руб.).

Справаводства па судовых справах вялося вусна і пісьмова. Пры гэтым, калі ў першай трэці XIX ст. існавала патрабаванне фарміравання спраў з падпісаннем падсудным усіх аркушаў, то ў канцы стагоддзя рашэнні ўносіліся ў шнураваныя кнігі за подпісамі членаў Савета, а ісцец і адказчык падчас следства маглі адсутнічаць пры наяўнасці доказаў. Гэтыя кнігі захоўваліся ў благачыннага з пячаткай і завяральным надпісам кансісторыі [17, Збор I, т. 38, № 29711; 12, арк. 66–66 адв.]. Аднак, па выніках праверкі кансісторыямі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. адзначалася нізкая эфектыўнасць дзейнасці Саветаў, у прыватнасці, благачыннымі зацягваўся разгляд спраў, адсутнічаў кантроль за выкананнем рашэнняў, часам, кліравыя ведамасці неадпаведна вяліся [16, арк. 168–172; 10].

Такім чынам, пасада благачыннага ў структуры праваслаўнай царквы на беларускіх землях уводзіцца ў XVIII ст. пераважна з выканаўчымі і кантрольнымі функцыямі ў дачыненні прыходскага духавенства. Знаходзячыся паміж ніжэйшым клірам і духоўнымі праўленнямі, якія мелі блізкія па змесце кампетэнцыі, благачынныя паступова ўмацоўвалі сваё палажэнне зніжаючы бюракратызм у дзейнасці царквы, што прывяло да ліквідацыі праўленняў. У другой палове XIX ст. сфера дзейнасці благачынных пашырылася да прадстаўніцтва інтарэсаў духавенства і царкоўных саветаў у кансісторыях, кантролю за выкананнем распараджэнняў канфесіянальнага кіраўніцтва на месцах, арганізацыі справаводства, разгляду дробных судовых спраў у Саветах. Пры гэтым яны карысталіся павагай і падтрымкай грамадства і святароў, праводзячы шырокую працу сярод насельніцтва прыходаў і рыхтуючы кадравыя змены сярод духавенства, што пераўтварыла благачынных у значны інстытут канфесіянальнай структуры.

## Літаратура

1. Евдокимова, А.Н. Духовная консистория, правление и благочинные священники в структуре управления русской православной церкви на территории Чувашского края в XIX веке // Вестник Чувашского университета. – 2015. – № 2. – С. 31–38.
2. Курилкин, И.Б. Структура епархиальных органов делопроизводства во второй половине XIX – начале XX века (на примере Оренбургской епархии) // Вестник Челябинского государственного университета. 2009. – № 41 (179). – История. – Вып. 38. – С. 119–122.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 4165.
4. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 4176.
5. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 4191.
6. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 5187.
7. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 16555.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

8. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40562.
9. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 40610.
10. НГАБ. – Ф. 2531. Воп. 1. Спр. 30.
11. НГАБ. – Ф. 2765. Воп. 1. Спр. 10.
12. НГАБ. – Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 17.
13. НГАБ. – Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 27.
14. НГАБ. – Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 64.
15. НГАБ. – Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 84.
16. НГАБ. – Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 139.
17. Полное собрание законов Российской Империи с 1649 г. – Собрание первое: в 45 т. – Санкт-Петербург: Тип. II отд. соб. ЕИВ канцелярии, 1830 – 1851; Собрание второе: в 55 т. – Санкт-Петербург: Тип. II отд. соб. ЕИВ канцелярии, 1830 – 1884.
18. Цысь, О.П. Духовные правления как звено церковного управления на тобольском севере в 1810–1860-х гг. // Вестник ПСТГУ. Серия II: История. История Русской Православной Церкви. – 2017. – Вып. 75. – С. 22–38.
Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова